# Рэспубліканская бібліятэка—калгаснікам

Беларуская дзяржаўная бібліятэка імя Леніна атрымала пісьмо ад групы калгаснікаў сельгасарцелі «Новае жыццё» Дзісненскага раёна Полацкай вобласці. «Мы хочам арганізаваць калгасную пасеку,—пішуць яны,—і не проста арганізаваць, а абсталяваць яе па апошняму слову навукі. Просім прыслаць нам новыя кнігі па пчалярству». Просьба калгаснікаў была неадкладна выканана. Ім адпраўлена пасылка з кнігамі.

Нядаўна паштальён прынёс у бібліятэку пісьмо з паметкай «Тэрміновае—убрачнае». У гэтым пісьме дырэктар Клецкай МТС Баранавіцкай вобласці пісаў: «Намі атрымана новая тэхніка—самаходныя камбайны. Механізатары гараць жаданнем выкарыстаць іх найбольш эфектыўна. Патрэбна літаратура аб эксплаатацыі камбайна С-4». Авіяпоштай у МТС была адпраўлена кніга «Самаходны камбайн С-4».

Больш трох тысяч кніг палітычнай, мастацкай і сельскагаспадарчай літаратуры выслаў з пачатку гэтага года міжбібліятэчны абанемент рэспубліканскай бібліятэкі па просьбах калгаснікаў і спецыялістаў сельскай гаспадаркі рэспублікі.

Зараз бібліятэка імя Леніна прыступіла да выдання серыі бібліяграфічных зборнікаў для калгаснікаў. Вышаў у свет першы зборнік «Што чытаць па пытаннях арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў». Рыхтуюцца да друку спісы рэкамендуемай літаратуры па жывёлагадоўлі, механізацыі сельскай гаспадаркі, асновах аграбіялагічнай навукі.

(БЕЛТА).